**Варонка Іосіф Якаўлевіч** (4.04.1891–4.06.1952) – беларускі палітычны дзеяч, журналіст, публіцыст. Ураджэнец Сакольскага павета. Быў вольным слухачом юрыдычнага факультэта Санкт-Пецярбурскага ўніверсітэта. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. стаў сябрам Беларускай сацыялістычнай грамады, з чэрвеня – у складзе ЦК БСГ, прадстаўляў беларускія інтарэсы ў Асобай нарадзе для выпрацоўкі палажэння аб выбарах ва Усерасійскі Устаноўчы сход. Да снежня 1917 г. узначальваў камітэт Беларускага таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны. Удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні Усебеларускага з'езда 1917 г. У лютым–ліпені 1918 г. узначальваў Народны Сакратарыят Беларусі, займаў пасаду Народнага Сакратара замежных спраў. Адзін з ініцыятараў абвяшчэння БНР, уваходзіў у склад Рады БНР

З расколам БСГ увайшоў у склад Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў. Быў рэдактарам часопісу «Варта», газеты «Беларускі народ».

У снежні 1918 – красавіку 1920 г. – міністр беларускіх спраў і член кабінета Літоўскай Рэспублікі, з вясны 1921 г. старшыня беларускага Чырвонага Крыжа, з восені 1922 г. старшыня Беларускай грамады ў Коўне.

У 1923 г. выехаў у Чыкага ў ЗША. Узначальваў Беларуска-амерыканскую нацыянальную асацыяцыю, быў адным з кіраўнікоў Беларуска-амерыканскай нацыянальнай рады, выдаваў газету «Белорусская трибуна», вёў беларускія і рускія праграмы на чыкагскім радыё.